**Гарузава, Н.** Залпы народных мсціўцаў / Н. Гарузава, С. Голубеў // Камуністычны шлях (Расоны). – 1976. – 21 лют. – С. 2.

## ЗАЛПЫ НАРОДНЫХ МСЦІЎЦАЎ

Фашысцкія карнікі імкнуліся ў што б там ні стала захапіць Клясціцы. Яны вялікімі сіламі рухаліся на бальшаках з Себежа і з Невеля. У лютым 1943 года для партызан надыйшоў крытычны момант. Вораг уварваўся ў вёскі Паўлава і Велле. Над Клясціцамі павісла смяртэльная пагроза.

У Паўлаве карнікаў спынілі злучаныя сілы беларускіх, рускіх і латвійскіх партызан. А ў баі каля Велля вырашальную ролю ў разгроме гітлераўскіх катаў адыграла артылерыя брыгады імя Сталіна. Калі фашысты сунуліся з Велля на Шалашнікі, іх агнём і жалезам накрылі снарады з 12 гармат, якія былі ўстаноўлены ля Казімірова і Сінска. Уцалелыя гітлераўцы паспяшаліся адступіць…

Партызанскі «бог вайны» пачаў ствараццa на Расоншчыне з самага пачатку развіцця руху народных мсціўцаў. Яшчэ ўлетку 1941 года патрыёты сабралі на палях і ў лясах раёна ўсе пакінутыя гарматы і снарады, схавалі іх. А праз год у даваеннай Краснапольскай МТС арганізавалася майстэрня па рамонту гармат, бо некаторыя з іх былі без замкоў і з іншымі недахопамі. Быў востры недахват снарадаў, і рамонтнікі таксама знайшлі выхад. Выкарыстоўвалі пустыя гільзы. Для гэтага на такарным станку прасвервлівалі адтуліну на месцы выстралянага капсуля, заганялі туды вінтовачны патрон без кулі, набівалі гільзу порахам і замацоўвалі боегалоўку, якіх было ў брыгадзе некалькі скрынак.

Дні і ночы працавалі ў майстэрні рамонтнікі-ўмельцы. Там рыхтавалі грозную зброю Сяргей Гольнеў, Іван Ткачэнка, Васіль Максімаў, Купрыян Лапенка, Лявон Сапега… Мужнымі артылерыстамі былі Яфім Лазарэнка, Мікалай Голубеў, Кірыла Гвоздзеў, Барыс Карасёў, Іван Дзем'яненка, Васіль Луфераў і інш. Адны з іх дажылі да сённяшняга дня, іншых няма ў жывых. Усе яны прыбліжалі светлае, мірнае жыццё, і мы павінны помніць пра іх баявыя справыю

**Н. ГАРУЗАВА,**
**С. ГОЛУБЕЎ**